# МЫТНЫ КОДЭКС СССР 1928 г.: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫ АНАЛІЗ

*К.М. Нашчынец*
*Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

19 снежня 1928 г. пастановай ЦВК і СНК СССР быў зацверджаны першы мытны кодэкс СССР, які дзейнічаў амаль 36 гадоў. Сёння Рэспубліка Беларусь з’яўляецца удзельнікам інтэграцыйных аб’яднанняў, дзяржаўныя органы нашай краіны праводзяць кіраванне мытнай справай зыходзячы як з нацыянальных інтарэсаў, так і ўлічваючы наяўнасць наднацыянальных органаў ЕАЭС (напрыклад, Еўразійскай эканамічнай камісіі), патрабаванняў заканадаўства ЕАЭС. У дадзенай сітуацыі зварот да гістарычнага досведу арганізацыі аховы дзяржаўнай мяжы, калі дзяржаўныя органы БССР таксама ажыцяўлялі сваю дзейнасць пры наяўнасці наднацыянальных органаў і патрабаванняў заканадаўства, уяўляе сабой вялікую важнасць і абумоўлівае актуальнасць дадзенай праблематыкі.

Мэтай даследавання з’яўляецца выяўленне сутнасці і асаблівасці рэгулявання мытнай справы мытным кодэксам СССР 1928 г.

**Матэрыял і метады.** Асноўным матэрыялам даследавання выступае мытны кодэкс СССР 1928 г, 129 і 130 фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Метадамі даследавання з’яўляюцца метады параўнальнага аналізу, сінтэзу, дэдукцыі і індукцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першы Мытны кодэкс СССР (далей – МК) набыў моц з 1929 г. Кодэкс складаўся з чатырох раздзелаў (Аб арганізацыі мытнага кіравання; Аб мытных аперацыях; Аб кантрабандзе, спагнаннях за яе і вядзенні спраў аб кантрабандзе; Аб парадку спагнання мытных пошлін і збораў, а таксама штрафаў за парушэнне мытных пастаноў) і 188 артыкулаў. Устойліва стаў ператтварацца ў жыццё прынцып недыскрымінацыі і найбольшага спрыяння ў знешнім гандлі. Пры пропуску пасажырскіх рэчаў і паштовых адпраўленняў для асабістага спажывання ўстанаўліваліся спісы і нормы рэчаў, што прапускаліся без ліцэнзіі, але з аплатай мытных пошлін.

У 1920-я гг. даволі распаўсюджаным было меркаванне, што мытныя пошліны маюць толькі фіскальнае значэнне, а для абароны інтарэсаў краіны дастаткова манаполіі знешняга гандлю, таму для абароны мытнай сістэмы патрабаваліся новыя аргументы. Так, пры распрацоўцы мытнага кодэкса шмат увагі было нададзена кантрабанднай складаючай. Трэці раздзел МК падрабязна развіваў паняцце адміністрацыйна-каральнай кантрабанды, адзначаючы 12 магчымых варыянтаў. Акрамя ўжо вядомага вызначэння кантрабанды, кантрабандай таксама лічылася атрыманне з-за мяжы грузаў, нават пры наяўнасці устаноўленых дазволаў і аплаты пошліны, калі ўвоз або атрыманне грузаў быў звязаны з незаконным вывазам, перакладам ці перасыланнем за мяжу валютных і фондавых каштоўнасцей. «Навэлай» мытнага кодэкса выступала прыраўноўванне да кантрабанды здзяйснення ўсякага роду падрыхтоўчых дзеянняў, пералічаных у МК.

У першым раздзеле кодэкса вызначаліся мэты дзейнасці мытных устаноў: асноўная і традыцыйная – спагнанне мытных збораў і дадатковая – здзяйсненне ўсіх іншых мытных аперацый. Яшчэ адной, асаблівай, задачай мытных органаў (прадыктаванай спецыфікай часу) з’яўляўся кантроль за выкананнем пастаноў аб дзяржаўнай манаполіі знешняга гандлю. Шырэй, чым у Мытным статуце 1924 г., удакладняліся паўнамоцтвы Галоўнага мытнага ўпраўлення (далей – ГМУ), распрацоўка пытанняў датычных мытнай палітыкі, удзел у распрацоўцы праектаў міжнародных дагавораў і канвенцый, распрацоўка праектаў мытных тарыфаў і вырашэнне пытанняў, звязаных з іх ужываннем. Адпаведна з арт. 16 МК, да мясцовых (маецца на ўвазе ўзровень рэспублік СССР) мытных устаноў адносіліся аддзяленне ГМУ, мытні і мытныя пасты. «Навэла» МК у тым, што ў структуры мытных органаў было ліквідавана прамежкавае звяно – раённыя інспектарскія мытныя ўпраўленні.

Неабходна звярнуць увагу і на сам працэс распрацоўкі кодэкса. Яго праекты былі накіраваны на абмеркаванне ва ўсе аддзяленні ГМУ і мытныя установы. На што, напрыклад, ад Негарэлаўскай мытні быў атрыманы наступны адказ: «*Беларускаму аддзяленню ГМУ. 25 лютага 1927, №858. Негарэлаўская мытня прадстаўляе пры гэтым свае меркаванні, падрабязна выкладзеныя ў пратаколе Тэхнарады ад 24 гэтага лютага, якія на думку Мытні неабходна ўнесці ў праект выпрацоўкі мытнага кодэкса* [1]. <…> *Пратакол. Дапаўненні: - Унесці заўвагу да арт. 65 «раёнам мытні лічыцца размяшчэнне станцыі ад уваходнага да*

*выпускнога семафора /дыска». - Арт. 73. Літ «Б». пасля слоў «у іншую мытню» дапоўніць «толькі ў тым выпадку, калі па шляху руху знаходзіцца або калі з-за тэхнічных недахопаў груз не можа быць дагледжаны ў памежнай мытні». - Арт. 152. Заўвага 3. Канец тэксту замяніць словамі «падлягаюць канфіскацыі з накладаннем штрафу»* [2]. Трэба адзначыць, што ні адна з прапаноў не знайшла падтрымкі на вышэйшым узроўні і не была ўнесена ў канчатковы варыянт мытнага кодэкса.

Тым не менш, пасля набыцця моцы МК, дапаўненні ўсё ж унасіліся. У канцы 1930-х гг. кодэкс быў дапоўнены правіламі пропуску праз мяжу прадметаў, якія падлягалі разгляду органамі Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў (так, адной з галоўных функцый мытнікаў станавілася выяўленне ідэалагічна небяспечных друкаваных матэрыялаў і прэсавых выданняў. Канфіскацыі падлягала рознага кшталту замежная літаратура і перыёдыка, а таксама кнігі духоўнага зместу. Так, 22 ліпеня 1935 г. Негарэлаўскай мытняй у грамадзяніна ЧСР Яна Міхноўскага была канфіскавана «кніга дарэвалюцыйнага выдання на нямецкай мове «Вучэнне Хрыста» Марціна Лютэра» [3]), указаннямі аб парадку правядзення каранціннага надгляду (загад ГМУ № 15 ад 25 сакавіка 1937 г.), аб ажыццяўленні ветэрынарна-санітарнага нагляду на межах СССР. У артыкулах 132 - 139 Кодэкса паводле загаду ГМУ № 24 ад 7 жніўня 1938 г. выкладаліся правілы пропуску паштовых адпраўленняў. У развіццё палажэнняў кодэкса загадам ГМУ № 183 ад 25 верасьня 1933 г. вызначаліся правілы пропуску мытнямі дыпламатычных кур'ераў СССР і іх афіцыйных грузаў і багажу. Яшчэ больш складанымі сталі мытныя аперацыі ў 1930 годзе, калі былі адмененыя 8 артыкулаў Мытнага кодэкса: некаторыя правілы аб даглядзе грузаў, спагнанні клеймільнага збору за накладанне мытных пломбаў, клеймаў, правіла аб страхаванні ад агню грузаў, якія знаходзіліся на мытных складах і г.д [4].

**Заключэнне.** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 5 мая 1964 г. быў зацверджаны другі Мытны кодэкс СССР, уведзены ў дзеянне з 1 ліпеня 1964 г. Сярод важных асаблівасцяў перашага мытнага кодэкса СССР неабходна вылучыць больш грунтоўнае вызначэнне задач, функцый і паўнамоцтваў ГМУ, змену структуры мытных органаў – было ліквідавана прамежкавае звяно – раённыя інспектарскія мытныя ўпраўленні. Згодна з кодэксам на мытныя органы ўскладаліся тры галоўныя задачы: кантроль за выкананнем пастаноў вышэйшых органаў улады аб дзяржаўнай манаполіі знешняга гандлю, збіранне мытных збораў і ажыццяўленне іншых мытных аперацый.

Спіс літаратуры

1. НАРБ. – Ф. 129, Воп. 1, Спр. 948, Арк. 156.
2. НАРБ. – Ф. 129, Воп. 1, Спр. 948, Арк. 157.
3. Нашчынец, К. М. Заходні фарпост савецкай дзяржавы: невядомыя факты з гісторыі Негарэлаўскай мытні / К. М. Нашчынец // Таможенное дело и ВЭД: сборник докладов участников СНИЛ «Теория и практика таможенного дела и внешнеэкономической деятельности». — Вып. 1. — Минск: БГУ, 2013. — С. 249 - 261.
4. Острога В.А. История таможенного дела Беларуси: Уч.метод пособие./ В.А. Острога.- Мн.:, 2010. – 65 с.
5. Таможенный устав СССР: утвержден Постановлением ЦИК Союза ССР 12 декабря 1924 г.: Систематический сборник действующих таможенных постановлений, правил, инструкций, списков, циркуляров и разъяснений, а также извлечений и др. законоположений и распоряжений, необходимых в таможенном деле. – М., 1925.
6. Таможенный кодекс СССР: утвержден Постановлением ЦИК и СНК СССР от 19 декабря 1928 г.: Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского Правительства СССР, издаваемое Управлением Делами Совета Народных Комиссаров Союза ССР и Совета Труда и Обороны 11 января 1929 г. №1: текст по состоянию на 11 января 1929 г. – М., 1929.

## САМЫЯ АТРАКЦЫЙНЫЯ АБ’ЕКТЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*М.В. Півавар*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Наяўнасць гісторыка-культурных і прыродных аб’ектаў з’яўляецца важнай прычынай выбару наведвання краіны. Значыць, ад ступені выяўленасці атракцыйных аб’ектаў і іх прэзентаванасці залежыць аб’ём турыстаў, які патэнцыяльна могуць наведаць краіну і адпаведна дазволіць зарабіць грошы. Гэты тэзіс справядлівы як для міжнароднага турыста, так і для ўнутранага.

Мэта артыкула, скласці спіс найбольш цікавых і арыгінальных аб’ектаў турыстычнага паказу (матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны) Віцебшчыны, якія могуць спрыяць прыцягненню турыстаў у рэгіён.



Репозиторий ВГУ